# Славянская спадчына: канферэнцыя ў Томску

У сярэдзіне мая па ініцыятыве Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Томскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і Нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Томскай вобласці адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Захаванне славянскай гісторыка-культурнай спадчыны: вопыт, праблемы і перспектывы».

Ідэя правядзення канферэнцыі з'явілася пад час знаёмства з кіраўніком беларускай дыяспары Томскай вобласці Любоўю Адаскевіч, якая летась у складзе дэлегацыі прыехала ў Мінск на II Рэспубліканскі фестываль мастацтваў беларусаў свету. Дзякуючы дацэнту Таццяне Ганчаровай гэтую думку падхапілі на кафедры сусветнай гісторыі томскага ўніверсітэта. Вынікам стала сур'ёзнае навуковае мерапрыемства, якое аб'яднала больш за 50 навукоўцаў з Мінска, Томска, Новасібірска, Барнаула, Кемерава, Северска, Марыупаля, Вроцлава, Ерэвана. Беларусь прадстаўляў аўтар гэтых радкоў, Польшчу – былы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, супрацоўнік Дэпартамента грамадскай і культурнай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Польшчы Марыуш Машкевіч, Генеральны Консул Рэспублікі Польшча ў Іркуцку Марэк Зялінскі, дырэктар Польскага культурнага цэнтра ў Маскве Дарыуш Кляхоўскі ды іншыя.

На канферэнцыі абмяркоўваліся наступныя пытанні: вопыт адраджэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны славянаў, асаблівасці рэпрэзентацыі і трансляцыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны славянскіх народаў, асаблівасці функцыянавання дыяспараў славянскіх народаў у сучасным свеце, праблемы захавання нацыянальнай ідэнтычнасці славянаў ды інш. Тэмы дакладаў былі самымі рознымі: ад разгляду феномена славянскай кнігі, праблемаў трансляцыі песеннага фальклору перасяленцаў, вясельнай абраднасці і тэхналогіяў сельскагаспадарчай вытворчасці да інавацыйных тэхналогіяў турыстычнай дзейнасці.

Варта сказаць, што на базе гісторыка-філалагічнага факультэта ТДПУ адкрыты Цэнтр руска-польскай мовы – прадстаўніцтва Вроцлаўскага ўніверсітэта (Польшча). Студэнты, якія засвоілі праграму адпаведнай лінгвістычнай падрыхтоўкі, могуць стажыравацца або працягнуць навучанне ў Польшчы па магістарскай праграме двайных дыпломаў «Лінгвакультуралогія». Часта праводзяцца выязныя археалагічныя, фальклорныя і дыялекталагічныя практыкі ў розных рэгіёнах Расіі.

Знаёмства з дзейнасцю факультэта культуры і мастацтваў ды гісторыка-філалагічнага факультэта пакінула прыемнае ўражанне, як і гутаркі з іх дэканамі Таццянай Галкінай і Кацярынай Каюмавай. Яны паказалі свае бібліятэчныя зборы, галерэі, музеі, майстэрні і выставачныя калекцыі, сабраныя студэнтамі і педагогамі пад час экспедыцыяў. Паміж факультэтам культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКМ і гісторыка-філалагічным факультэтам ТДПУ падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі таксама гістарычныя мясціны і ўстановы культуры, напрыклад, Першы музей славянскай міфалогіі, які называюць месцам павышэння кваліфікацыі музейных экскурсаводаў, а таксама помнікі драўлянага дойлідства, незвычайны тэатр лялек Уладзіміра Захарава «Два плюс Ку».

*Павел САПОЦЬКА, выкладчык кафедры міжкультурных камунікацыяў БДУКМ*



*З прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў Томску*

*Фота Галіны ГРОШАВАЙ (г. Томск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ